ГОД НАРОДНАГА АДЗІНСТВА

# Скрутак міру падарожнічае па раёне

**Грамадская акцыя «Скрутак міру» стартавала ў нашым раёне. На бялюткай банернай тканіне даўжынёй у 20 метраў кожная навучальная ўстанова зможа пакінуць сваё разуменне міру, дружбы, адзінства і пераемнасці пакаленняў.**




**Вучні СШ №1 імя Янкі Купалы Ульяна Рак, Ульяна Танкевіч і Дзяніс Шыман.**

Гэту акцыю ў рамках Года народнага адзінства ініцыяваў Мінскі абласны краязнаўчы музей, да якога далучылася ўпраўленне па адукацыі райвыканкама. Першымі своеасаблівую эстафету міру віталі ў СШ №1 імя Янкі Купалы.

Да настаўнікаў і вучняў звярнулася дырэктар абласнога краязнаўчага музея Алена Чарнецкая, якая заўважыла, што праект аб'ядноўвае моладзь адзінай творчай задачай – стварэннем скрутка міру, які назаўсёды захаваецца ў музеі як памяць пра пакаленне гэтых часоў. А кіраўнік СШ №1 Васілій Маліноўскі падкрэсліў, што прымаць эстафету першымі вялікі гонар. Дарэчы, віталі гасцей духмяным белым хлебам, які спякла шэф-повар Марыя Корастава.

— Скажу шчыра, мы ўжо засумавалі па масавых мерапрыемствах, таму рыхтаваліся з асаблівым настроем, — заўважае намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Наталля Вяршыцкая. – Пакуль не будзем раскрываць сакрэт, якая творчая работа з'явіцца на скрутку міру, але яе тэму вызначылі яшчэ загадзя: «У школе, дзе смяюцца дзеці, жыве шчасце».

Да прэзентацыі акцыі вучні падрыхтавалі творчую імпрэзу. Яна была прасякнутая любоўю да роднага краю, малой радзімы, якая з'яўляецца вытокам, пачаткам, адкуль чалавек робіць першы крок у вялікі свет, аб чым, безумоўна, трэба памятаць усё жыццё.

Тут шмат гаварылася пра дынамічнае і разнастайнае культурнае жыццё Беларусі, у тым ліку Маладзечаншчыны, дзе адбываецца мноства знакавых падзей і мерапрыемстваў, якія выклікаюць цікавасць і за межамі краіны.

... У кожнай навучальнай установе скрутак міру застанецца на тыдзень. Такім чынам ён будзе вандраваць да мая ўключна. Потым яго прадставяць у нашым краязнаўчым музеі на мерапрыемстве, прысвечаным Міжнароднаму дню абароны дзяцей, а затым — і на Нацыянальным фестывалі беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2021», які плануецца сёлета правесці.

**Ірына РАБУШКА.**
**Фота: Аляксей ПЛАТКО.**



**Скрутак міру даўжынёй у 20 метраў будзе вандраваць па нашым горадзе: кожная ўстанова адукацыі пакіне на ім сваё разуменне міру, дружбы, адзінства і пераемнасці пакаленняў.**




**Удзельнікі акцыі «Скрутак міру»: загадчык аддзела навукова-даследчай і экспазіцыйна-выставачнай работы абласнога краязнаўчага музея Вольга Шылько, дырэктар гэтай установы Алена Чарнецкая, кіраўнік СШ №1 імя Янкі Купалы Васілій Маліноўскі і яго намеснік па выхаваўчай рабоце Наталля Вяршыцкая разам са школьнікамі.**